# Герой вайны—герой рамана

Амаль чвэрць веку назад я прачытаў раман М. Аляксеева «Салдаты». На ўсё жыццё засталіся ў памяці строгі, але клапатлівы генерал-маёр Сізоў, адважны і вопытны камандзір стралковага палка Баталін, мужны артылерыст Гунько, смелы і кемлівы разведчык Шахаеў...

Я ведаў вайну і здзіўляўся, наколькі жывымі, праўдзівымі былі карціны баёў, герої рамана. Кніга расказвала аб удзеле гвардзейцаў дывізіі генерала Сізова ў бітве на Курскай дузе, фарсіраванні Дняпра, бітвах на Правабярэжжы Украіны, аб баях у Румыніі, Венгрыі, Аўстрыі, Чэхаславакіі.

Тады мне здалося, што галоўныя героі кнігі — вобразы зборныя. Бо раман — не дакументальны нарыс.

Але вось зусім нядаўна я пазнаёміўся з чалавекам, які паказаў мне кнігу «Салдаты», на тытульнай старонцы якой напісана: «Р. М. Баталаву — майму аднапалчаніну, выдатнаму военачальніку, які паслужыў прататыпам вобраза Баталіна ў гэтым першым маім творы, — на памяць. М. Аляксееў».

Рыгор Баталаў, сын беларускага чыгуначніка, нарадзіўся незадоўга перад Вялікім Кастрычнікам. Працаваць пачаў з чатырнаццаці гадоў у чыгуначным дэпо г. Віцебска, дзе працаваў і бацька, а затым і старэйшыя браты. Некаторы час узначальваў камсамольскую арганізацыю ў толькі што створаным калгасе ў глухой беларускай вёсцы. Камсамол накіраваў Рыгора ў Мінскае ваеннае вучылішча.

Р. Баталаў прайшоў вялікі шлях армейскага жыцця: ад курсанта да генерал-лейтэнанта, намесніка галоўнакамандуючага Групай савецкіх войск у Германіі.

Калі для Краіны Саветаў наступіў час суровых выпрабаванняў у Вялікай Айчыннай вайне, чырвоныя камандзіры, былыя курсанты ваенных вучылішчаў 20—30-х гадоў сталі на чале палкоў і дывізій, карпусоў і армій.

У Мінскім ваенным вучылішчы амаль адначасова з Р. М. Баталавым вучыліся і служылі затым вядомыя военачальнікі І. І. Якубоўскі, В. Ф. Маргелаў, М. Г. Вайнруб.

— Гэта быў пераднавальнічны час. Чорныя хмары паўзлі на нашу краіну. Асабліва папулярнай у тыя гады была песня «Если завтра война...», — успамінае Рыгор Міхайлавіч. — Яе спявала ўся краіна. І калі грымнула вайна, увесь савецкі народ, як адзін чалавек, стаў на абарону Радзімы... У чэрвені сорак першага года я камандаваў курсанцкім узводам. Разам з ім зведаў горыч першых няўдач. А пад Масквой мы атрымалі першую сапраўдную перамогу.

Уклад у яе ўнёс і Баталаў. Будучы слухачом курсаў пры акадэміі імя Фрунзе, ён у саставе зводнага батальёна быў наводчыкам гарматы пад Мажайскам.

Потым быў Сталінград. Тут, прама ў ходзе бою, дваццаціпяцігадовы капітан Баталаў прыняў стралковы полк. Здарылася гэта ў час жорсткіх сутычак на паўднёвых подступах да горада. З адной з часцей доўга не было сувязі. Высветліць абстаноўку камдыў даручыў афіцэру аператыўнага аддзялення капітану Баталаву. І ён, нягледзячы на складанасць задачы, змог у начны час знайсці полк. А затым, узначаліўшы яго па загаду Лосева, арганізаваў начны штурм Пясчанкі.

Калі камандзір дывізіі атрымаў данясенне аб авалоданні магутным вузлом варожай абароны, ён спачатку не паверыў у гэта, сам выехаў у Пясчанку. І тут, у будынку сельсавета, над якім развяваўся чырвоны флаг, абняў і расцалаваў капітана Баталава. Потым сказаў:

— Прымай, Рыгор Міхайлавіч, полк. Між іншым, што прымаць, калі ўжо камандуеш ім. Камандзірскага табе шчасця...

Са сваім стралковым палком Баталаў у ліку першых уварваўся ў паўднёвыя прыгарады Сталінграда, павёў батальён да цэнтра горада. Пераадольваючы моцнае супраціўленне гітлераўцаў у вулічных баях, выйшаў да плошчы Загінуўшых барацьбітоў, да будынка цэнтральнага універмага, у падвалах якога знаходзіўся штаб Паўлюса.

Узнагародай за Сталінград была перамога, прысваенне дывізіі звання гвардзейскай.

Пасля вызвалення Харкава гвардзейскі полк Баталава ў ліку першых начным штурмам авалодаў Краснаградам. У ліку першых выйшаў да Дняпра, на паўднёвы ўсход ад Крамянчуга.

Фарсіраванне ўкраінскай ракі — адна з гераічных старонак у баявой гісторыі палка, у біяграфіі яго камандзіра.

— Мы рваліся наперад, да Дняпра, гатовыя фарсіраваць яго з ходу, — успамінае Рыгор Міхайлавіч. — Кожным з нас валодаў высокі наступальны дух. І зноў паўтараю: наш савецкі салдат на шляху да перамогі творыў цуды. У нас не было штатных пераправачных сродкаў, рака разлілася асеннім разводдзем, дасягала ў шырыню да сямісот метраў. І ўсё ж полк у першую ж ноч пачаў пераправу. На рыбацкіх лодках, бочках, плытах, бярвеннях...

Рыгор Міхайлавіч змоўчаў пра тое, што ён, як і на Данцы, перайшоў на той бераг з перадавым атрадам.

Высокімі ўзнагародамі ўславіла Радзіма ўдзельнікаў бітвы за Днепр. 27 воінам дывізіі прысвоена званне Герояў Савецкага Саюза. Сярод іх быў і гвардыі маёр Р. М. Баталаў.

Амаль сорак гадоў прысвяціў службе ў Савецкай Арміі Р. М. Баталаў. Пасля вайны ён працягваў службу на Урале і ў Забайкаллі, на Каўказе і ў Беларусі, на Украіне і ў Групе савецкіх войск у Германіі. Грудзі заслужанага ветэрана ўпрыгожваюць Залатая Зорка Героя, ордэны Леніна, чатыры ордэны Чырвонага Сцяга, ордэны Кутузава, Чырвонай Зоркі, пятнаццаць медалёў.

**І. КОРБАЧ,**
**падпалкоўнік запасу.**